# НАЦЫЯНАЛЬНАЕ І ЎНІВЕРСАЛЬНАЕ Ў «АПОКРЫФЕ» МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

**П. А. Давыдава**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*palinadavydava@gmail.com;*
*навук. кір. – Г. М. Бутырчык, канд. філал. навук, дац.*

Мэтай дадзенай працы з’яўляецца раскрыццё нацыянальнага і ўніверсальнага складніка ў апавяданні «Апокрыф» Максіма Багдановіча. Нацыянальныя рысы перадаюцца праз нацыянальныя сімвалы, мастацкія дэталі і фальклорную традыцыю; універсальныя рысы перадаюцца праз біблейскія вобразы і сімвалы і жанр твора.

***Ключавыя словы:*** нацыянальнае; універсальнае; апокрыф; прыпавесць; Максім Багдановіч.

Нацыянальны светапогляд і светаўспрыманне перадаецца праз адметныя для пэўнай нацыі вобразы, сімвалы, мастацкія дэталі. Універсальнае закранае агульначалавечыя каштоўнасці і выяўляецца праз універсальныя сімвалы і вобразы, якія аднолькава ўспрымаюцца ў розных культурах. Пры гэтым нацыянальнае не супрацьпастаўляецца ўніверсальнаму, а існуе поруч, дадаючы асаблівасці нацыі да агульначалавечых паняццяў.

Апавяданне «Апокрыф» Максіма Багдановіча было напісана і ўпершыню выдадзена ў 1913 годзе ў зборніку «Калядная пісанка». Назва «Апокрыф» накіроўвае на жанравую прыналежнасць твора. Апокрыф (грэч. Apokryphos – скрыты, таемны, запаветны) – твор, які развівае тэмы, ідэі і сюжэты Старога і Новага Запаветаў, які арыентуецца на кананічныя формы, але па якіх-небудзь прычынах не ўваходзіць у канон [3, с. 44]. Жанр апокрыфа іншым чынам трактуе кананічную гісторыю або дапаўняе яе. Адпаведна, Максім Багдановіч, уводзячы назву «Апокрыф», задае пытанне пра патрэбнасць людзей у творчасці і творцах.

«Апокрыф» Максіма Багдановіча пачынаецца словамі «Ад Максіма Кніжніка пачатак...» [1], што нагадвае пачатак Евангелля ад Марка «Пачатак Евангелля Ісуса Хрыста, Сына Божага». Твор Максіма Багдановіча па форме падобны да евангелічнага падання, у ім маецца падзел тэксту на вершы, пазначаныя лічбамі. Такая форма напісання набліжае твор Багдановіча да біблейскага тэксту, а значыць, і да сусветнай культуры, да ўніверсальнага.

«Апокрыф» Максіма Багдановіча таксама можна аднесці і да жанру прыпавесці. Прыпавесць – эпічны жанр, які ўяўляе сабой кароткі павучальны аповед у алегарычнай, іншасказальнай форме [4, с. 808]. Твор пачынаецца вандраваннем Ісуса Хрыста, святога Пётры і святога Юр'і па

«ўсім Забраным Краі» [1], падчас якога ўзнікае пытанне: ці ёсць месца творчасці пасярод цяжкай працы. Ад гэтага пытання і зыходзяць усе павучэнні, якія маюцца ў творы: развагі селяніна і Ісуса Хрыста, развагі Ісуса Хрыста і Пётры, заключнае настаўленне Ісуса Хрыста. Кампазіцыя «Апокрыфа» кальцавая, што таксама характэрна для прыпавесці: твор пачынаецца вандроўкай і заканчваецца тым, што вандроўнікі зноў крочаць разам. Асноўны мастацкі прыём, на якім будуецца «Апокрыф», – алегорыя.

Тэма твора Максіма Багдановіча развіваецца ў трох накірунках: погляд музыкі, погляд Ісуса Хрыста і погляд святога Пётры. Музыка пры сустрэчы з Хрыстом і Пётрам кажа: «…сорамна мне, бо сягоння дзень працы і ўсе клапоцяцца каля зямлі; адзін я нікчэмны чалавек» [1]. Ён сумняецца ў сваёй справе і ў патрэбе мастацтва людзям, якія цяжка працуюць. Аднак Хрыстос падтрымлівае музыку, абараняе творчасць: «…няма праўды ў тым, каторы кажа, што ты – лішні на зямлі. Запраўды кажу я табе: надыйдзе яму гадзіна горычы – і чым ён разважыць тугу сваю, апроч песні твае? Як у дзень смутку, таксама ў дзень радасці ён прызавець цябе» [1]. Супрацьлеглую пазіцыю мае святы Пётра: «…у гэтай краіне ёсць людзі, каторым няма чаго есці. Ці ж не сціснецца ад сораму сэрца таго чалавека, каторы, шукаючы скарынкі хлеба, прыйдзе з песняй да іх?» [1]. Ён лічыць, што мастацтва не можа існаваць пасярод працы, але пасля згаджаецца пры ўмове, што «…будуць думкі добрыя і навучаючыя, каб апроч красы, быў у іх і спажытак чалавеку» [1].

Вобраз Ісуса Хрыста ў «Апокрыфе» – гэта вобраз творцы, які ўпэўнены ў харастве мастацтва. Уведзены Максімам Багдановічам вобраз Хрыста з’яўляецца біблейскім вобразам, таму ён універсалізуе праблему творцы і творчасці, узнятую ў «Апокрыфе». На працягу ўсяго «Апокрыфа» праца фізічная супрацьпастаўляецца працы духоўнай: песня – жніво, песня – скарынка хлеба, краса – спажытак, васількі – збожжа, васількі – каласы. Аднак у фінале твора Максім Багдановіч сцвярджае, што прыгажосць і праца не могуць існаваць адно без другога: «…няма красы без спажытку, бо сама краса і ёсць той спажытак для душы» [1]. Алесь Разанаў у сваім эсэ «Жыта і васілёк» піша: «Як бачым, краса ў “Апокрыфе” займае ўсе планы; у ёй сустракаюцца і з’ядноўваюцца ўсе пачаткі – цялесны, душэўны і духоўны; яны з’ядноўваюцца ў красе настолькі цэласна і непарыўна, што іх нельга разасобіць. Паспрабуйце гэта зрабіць – не ўдасца, бо цела – яно ўжо і душа, а душа – яна ўжо і дух» [5, с. 61]. Духоўныя і матэрыяльныя каштоўнасці ў «Апокрыфе» выяўляюцца праз нацыянальную раслінную сімволіку: духоўнае – васілёк, матэрыяльнае – каласы. Адбываецца яднанне духоўнай працы і фізічнай, і Хрыстос прамаўляе: «…добра быць

коласам; але шчаслівы той, каму дадзена быць васільком. Бо нашто каласы, калі няма васількоў?» [1]. Паралельна адбываецца і яднанне сімвалаў і вобразаў: спалучаюцца нацыянальныя сімвалы каласы і васількі з універсальным вобразам Хрыста. Пры гэтым вобразу Хрыста яшчэ ў пачатку твора надаецца нацыянальнае адценне, бо вандроўнікі былі апранутыя ў «белы кужаль ды суконныя світкі» [1]. Ісус Хрыстос падарожнічае не па абстрактнай зямлі, а «…па Занёманшчыне, і па Задзвіншчыне, і па Бярэзінскай зямлі» [1], – па беларускай зямлі.

Акрамя сімвалаў, нацыянальнае транслюецца праз фальклор (каляндарна-абрадавыя песні). Спачатку Хрыстос кажа: «…пад песні кладуць чалавека ў калыску, і з спевамі ж апушчаюць у магілу яго» [1]. Музыка ж працягвае гэтую думку, але абапіраецца на звычкі свайго народа: «…пяюць на Каляды, на Запускі, на Вялікдзень, на Тройцу, на Яна Купалу, у Пятроўку, на зажынках і дажынках. Пяюць на радзінах і хрэсьбінах, пяюць дзіцё калыхаючы, і самі дзеці пяюць гуляючы; пяюць на ігрышчах і вяселлях, і на хаўтурах, і ў бяседзе, і пры працы, і на вайну ідучы, і ўва ўсякай іншай прыгодзе. Увесь круглы год пяюць» [1]. Песня з’яўляецца сімвалам творчасці, і ў фінале твора вандроўнікі і селянін чуюць песню жнеек «…няма лепш цвяточка над васілёчка» [1]. Гэта даказвае каштоўнасць мастацтва ў паўсядзённым жыцці: «Жывая яшчэ душа ў народзе гэтым» [1]. Хрыстос апраўдаў музыку, што складаў песні падчас жніва, а разам з гэтым апраўдаў існаванне творцы і творчасці. Менавіта таму Хрыстос, Пётра і Юр’я моўчкі і разам сыходзяць. Максім Багдановіч пакідае папярэджанне людзям, каб тыя не забываліся на сваё мастацтва і традыцыі: «Але гора вам, людзі, бо даўно ўжо затапталі вы іх» [1].

Вобраз музыкі – нацыянальны, і варта звярнуць увагу, што першы твор Максіма Багдановіча мае назву «Музыка». У «Апокрыфе» Хрыстос прамаўляе: «…ты, шкадуючы галодных людзей, асудзіў песню, але самі галодныя не асудзілі яе» [1]. Людзі не выракаюцца сваёй творчасці, яе існаванне натуральнае для іх, што спраўджваюць радкі з «Музыкі» Максіма Багдановіча: «І з-памеж таго народу, катораму ён калісь граў, выйдуць дзесяткі новых музыкаў і граннем сваім будуць будзіць людзей к свету, праўдзе, брацтву і свабодзе...» [2]. Пастаянная прысутнасць творцы ў беларускім свеце прасочваецца па творах, якія працягваюць разважанні наконт хараства і мастацтва: Янка Купала «Курган», Змітрок Бядуля «Бондар», «Велікодныя яйкі», Уладзімір Жылка «Максім Багдановіч», «Хараство», дзённікавыя запісы, Уладзімір Караткевіч «Цвыркун і праблема чыстага мастацтва», Алесь Разанаў «Жыта і васілёк».

Такім чынам, універсальныя рысы «Апокрыфа» прасочваюцца праз біблейскія вобразы і сімвалы (Ісус Хрыстос, святы Пётра, святы Юр'я) і праз жанр твора (апокрыф-прыпавесць); нацыянальныя рысы заўважныя на ўзроўні нацыянальных сімвалаў (васількі, каласы), мастацкіх дэталей (адзенне вандроўнікаў, месца падарожжа), згадак пра фальклорную традыцыю (каляндарна-абрадавыя песні).

**Бібліяграфічныя спасылкі**


1. *Багдановіч, М. А.* Апокрыф [Электронны рэсурс] / М. А. Багдановіч. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Maksim_Bahdanovic/Apokryf.html. – Дата доступу : 25.02.2022.
2. *Багдановіч, М. А.* Музыка [Электронны рэсурс] / М. А. Багдановіч. – Рэжым доступу : https://knihi.com/Maksim_Bahdanovic/Muzyka.html. – Дата доступу : 25.02.2022.
3. *Гладкова, О. В.* Апокриф / О. В. Гладкова // Литературная энциклопедия терминов и понятий /А. Н. Николюкин [и др.]; под ред. А. Н. Николюкина. – Институт научн. информации по общественным наукам РАН. – М. : НПК «Интелвак», 2001. – С. 44–46.
4. *Гладкова, О. В.* Притча / О. В. Гладкова // Литературная энциклопедия терминов и понятий /А. Н. Николюкин [и др.]; под ред. А. Н. Николюкина. – Институт научн. информации по общественным наукам РАН. – М. : НПК «Интелвак», 2001. – С. 808–809.
5. *Разанаў, А. С.* З апокрыфа ў канон : гутаркі, выступленні, нататкі / А. С. Разанаў. – Мінск: І. П. Логвінаў, 2010. – 138 с.